# Пазакласнае чытанне

## 4 клас

# Хрэстаматыя



# *Змест*

**Цішка Гартны...3**
Верш «Восень»...3
**Янка Купала...4**
Верш «Вясна»...4
Верш «Над калыскай»...6
**Алесь Гурло...7**
Верш «Мой край»...7
**Змітрок Бядуля...8**
Сняжыначкі-пушыначкі...8
Дудачка...9
Казка пра мядзведзя...11
**Легенды...18**
Золата ў прыполе...18
Ліхая доля...20
**Апавяданні з кнігі «Ніколі не забудзем»...24**
Важнае заданне...24
Як я стаў гвардзейцам...28
Буду памятаць...35
Тата Гіса...37

# Цішка Гартны

## Верш «Восень»



І сумна, і нудна, і вецер пяе –
Асенняя песня жудой[1] аддае...
Прыбрана у полі, і пуста вакруг,
Адзежаю смутна апрануты луг.

Расліны жывое нідзе не відаць,
Ні голасу птушак нідзе не чуваць.
Толькі і ўбачыш па чорнай раллі
Сямейку сяўцоў невясёлых калі.

Ды мучаюць вуха ўсё крыкі варон,
Злятаючых ў кучу з усéнькіх[2] старон.
Ды вока яшчэ хіба можна спыніць
На нівах адзетых, дзе рунь зеляніць.

І сумна, і нудна! Пад вечар і з рання
Бялеюць усюды густыя туманы.
І хмаркі, як дзеці заклятай нуды,
Пярэсцяць і смуцяць там неба ўсягды.

І сумна, і нудна! І жаль так бярэ,
Што восень ізноў зажыла на дварэ,
Што так неўспадзéўкі[3] ў нягаданы час
Цяпло і прыволле пакінула нас.

---

[1] **Жуда** – трывожнае пачуццё страху.
[2] **З усенькіх старон** – з усіх бакоў.
[3] **Неўспадзеўкі** – нечакана, раптоўна.

# Янка Купала

## Верш «Вясна»

У вянку з пралесак,
У святлянай шаце[1]
Ходзе борам-лесам,
Полем, сенажацяй.

Сонцу-яснагрэю
Расплятае косы,
Раніцамі сее,
Як брыльянты, росы.

Сцелецца травіцай,
Ветрыкам шапоча,
Коціцца крыніцай,
Рыбкаю плюскоча.

Весела міргае
Сошцы і баронцы,
Зернятка хавае
Ў свежай баразёнцы.

У гайкі́ заходзе,
Шапаціць лісткамі;
Гутарку заводзе
З белкамі, дзятла́мі.

[1] **Святляная шата** – пышнае дарагое адзенне.



Роднае прыселле,
Вырай любіць вуча,
Лад вядзе ў капэ́ле[2]
Грамады пявучай.

Сяміцвет – вясёлкай
Ззяе над далінкай,
Ходзе за кароўкай,
Гляне і ў хацінку.

Дзецюку, дзяўчыне
Блогасна ўсміхнецца,
Штось на вуха кіне,
Закалоце сэрцам.

І ўсюды гэтак –
Полем, сенажацяй,
У кароне з кветак,
У святлянай шаце.

[2] **Капэла** – хор, а таксама змешаны ансамбль спевакоў і музыкантаў.

## Верш «Над калыскай»

Калыхала маці сына
У калысцы у ліповай
І пяя́ла яму песню
Вось як тутка, слова ў слова:

– Люлі, люлі, мой маленькі!
Спі і сні вясёлкі-гулі,
Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзься ты матулі.



Люлі, люлі, мой маленькі!
Спі, злажыўшы ўкрыж далонкі,
Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзься ты старонкі.

Люлі, люлі, мой маленькі!
Спі, як кветка напрадвесні[1],
Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзься гэтай песні.

Люлі, люлі, мой маленькі,
Набірайся моцы, сілы,
Як жа вырасцеш вялікім, –
Не забудзь маей магілы.

Люлі, люлі, мой маленькі!..
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Сын павырас, на лес гледзя,
А ці помніць песню маткі, –
Запытайся ў суседзяў.

[1] **Напрадвесні** – перад самым наступленнем вясны.

# Алесь Гурло

## Верш «Мой край»

Край мой там, дзе рэчак хвалі
І плюскочуць, і плывуць, –
Што далей – да новых даляў
Мяне клічуць і завуць.



Край мой там, дзе шэпчуць сосны,
Шумяць волаты-дубы…
Гэты шэпт і шум галосны
Ўсяму свету кажуць быль.

Край мой там, дзе поўны колас
За паклонам б’е паклон
І жняі шчаслівы голас
Заглушае сэрца звон.

Край мой там, дзе каля хаты
Аж да неба ўзняўся сад;
Там, дзе хлопцы і дзяўчаты
Апяваюць згоду, лад.

Край мой там, дзе Нёман льецца
Срэбна-плынным паласой,
Там, дзе ўсё, усё смяецца,
Шчасцем хваліцца, красой!

# Змітрок Бядуля

## Верш «Сняжыначкі-пушыначкі»

Сняжыначкі-пушыначкі
Ляцелі матылькамі,
Над хмызамі над шы́зымі[1]
Дыміліся дымкамі.

Зіхцеліся, мігцеліся
У розныя калёры.
Драбнюткія, пякню́ткія[2],
Як зораньки, як зоры.



Насіліся, кружыліся
Над ціхімі палямі.
Далінаочкі сняжыначкі
Пакрылі дыванамі.

Над елкамі, над хвойкамі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі.

Маленькія, міленькія,
Дзіцяткі-птушаняткі,
Ляціце вы, скачыце вы
У светленькія хаткі!

Вушастыя, пушыстыя,
З драцінкамі-вусамі
Вы, зайчыкі-малойчыкі,
У хаткі к нам таксама!»

Сняжыначкі-пушыначкі
Спявалі песні-баі:
«Мы хатачкі-палатачкі
Будуем тут у гаі».

---

[1] **Шызы** – цёмна–шэры з сіняватым адлівам.

[2] **Пякнюткі** – пекны, прыгожы, прывабны.

## *Верш «Дудачка»*

Баю, баю баечку,
Граю, граю граечку.
Я пайшоў далінаю,
Вузкаю сцяжынаю.
Там над самай рэчкаю
Ёсць кусты з парэчкамі.
Пад высокай кручаю –
Крапіва пякучая.
Ёсць лазіна стройная,
Гладкая і роўная.
Выразаў я дудачку,
Дудачку-пагудачку.
Засвістаў я птушкаю,
Птушкаю-пяюшкаю.
Заіграў я граечку,
Траля-траляляечку.
Рэхі пакаціліся –
Жаўранкі здзівіліся.
Камары зляцеліся –
Ім свістаць хацелася.
Пчолкі пазбіраліся –
Ім свістаць жадалася.
Гускі прывалюхалі[1],
Дудачку паслухалі.
– Дай нам, дай нам дудачку,
Дудачку-пагудачку.
– Дай нам, дай свісцёлачку
Пасвістаць пад ёлачкай.
Граю, граю граечку,
Траля-траляляечку.



[1] **Прывалюхаць** – прыйсці.

## Казка пра мядзведзя

Гэта ўсё было даўно.
Ранкам сцежкаю лясной
На прагулку пасля ночы
Касалапы Мішка крочыў.
Бачыць: Заяц на паляне
Завіхаецца старанна.
– Што ты робіш тут, касы?
Ад халоднае расы
Ты застудзіш грудзі, спіну,
Захварэеш на ангіну.
Кажа Заяц у адказ:
– Морква вырасла якраз,
Трэба, Мішка, паспяшацца.
Да зімы падрыхтавацца,
Каб затым у халады
Не было ў мяне бяды.
– Малайчына! – кажа Мішка,
– Мне таксама, можа, крышку
Морквы, братка, нацягаць,
На зіму нарыхтаваць?
– Калі ласка! Запрашаю, –
Усміхнуўся шчыра Заяц.
– Часу я не марнаваў,
Летам рупна працаваў.
Хопіць морквы нам з табой
Грызці лютаю зімой.
І пачаў як след Мядзведзь
Завіхацца на градзе.
Тут праходзіў міма Вожык,
Нёс прыгожы, новы кошык.
Пацікавіўся Мядзведзь,



Ці далёка ён ідзе,
І чаму яшчэ не спіць,
Што надумаўся рабіць.
– У бары – баравікі,
Ох, адказны час які! –
Кажа Вожык. – Да зімы
Рыхтавацца мусім мы.
Як насушым і насолім –
Будзе добрае застолле.
Будзе чым паласавацца,
Трэба мне, прабач, спяшацца.
– Дык хвіліначку пастой,
Я ў грыбы пайду з табой, –
Кажа Мішка. – Набяру –
Насушу і навару.
Кінуў моркву ён далоў,
Разам з Вожыкам пайшоў.
Назбіраў грыбоў нямала,
Весялей на сэрцы стала.
Ды Вавёрку на бярозе
Ён убачыў пры дарозе:
– Забаўляешся ды скачаш?
Ой, глядзі, зімой паплачаш.
Ці рыхтуешся, як мы,
Да халоднае зімы?
А Вавёрачка ў адказ:
– Ну, вядома! Самы час
у арэшніку арэхаў
Мне нарваць сабе паўмеха.
А яны заўжды зімой –
Самай лепшай смакатой.
Ажно рот раскрыў Мядзведзь,







За Вавёркаю ідзе.
Кінуў ён грыбы збіраць,
Стаў арэшнік выбіраць,
На якім арэхаў шмат,
Самых спелых акурат.
Ды на свой мядзведжы густ
Выбраў самы пышны куст.
І давай з карэннем рваць –
Сіл яму ж не пазычаць.
Раптам рыжая Лісіца,
Знакамітая хітрыца,
Паявілася з кустоў:
– Ну і справу ты знайшоў!
Лепей бы са мной пайшоў.
– А куды? – Мядзведзь зароў. –
Рыхтавацца да зімы,
Спадзяюся, будзем мы?
– Пазабавімся з курамі,
Ды й зіма не за гарамі.
Пойдзем, Мішка, да сяла,
Шмат разоў я там была,
Куры ў вёсцы – гэткі смак...
– Не, баюся я сабак, –
Спахапіўся тут Мядзведзь, –
Летась не загрызлі ледзь.
– Ой, спалохаўся, напэўна,
Вунь які ты здаравенны!
Ты за ўсіх дужэйшы, Мішка, –
Так яму ліслівіць Ліска, –
Абароніш і мяне,
Праўду я кажу ці не?
І Мядзведзь ад пахвалы





Пагадзіўся: – Я – ўдалы!
Левай лапай як махну!
Правай лапай як махну!
І сабакі хто куды
Разбягуцца ўсе тады. –
Ён пагрозна лапамі
Замахаў калматымі.
Сцежкай звілістай патрошкі
Падпаўзлі яны да вёскі.
Вось і курачкі-прысмакі,
Ды заўважылі сабакі.
Наляцелі на Мядзведзя –
Той уцёк ад зграі ледзьве.
Уцякаў як мог шпарчэй,
Пра Лісу, і пра курэй,
І пра хуткую зіму
Памяць выбіла яму.
Уцякаў ён, покуль мог,
Ды й на полі прама лёг.
А на гэтым полі рос
Жоўты, сонечны авёс.
У аўсе Мядзведзь прыціх:
Не чуваць сабак ліхіх.
Ён аддыхаўся і бачыць –
Побач Мышка шустра скача,
Зерне спелае зрывае
Ды ў нару сваю цягае.
І пытае ў Мышкі ён:
– Да зімы твой, пэўна, плён?
– Так, – адказвае малеча, –
А табе заняцца нечым?
Што ты ходзіш па аўсу,



Топчаш дзіўную красу?
І няёмка стала Мішку
Перад клапатлівай Мышкай:
– Дык і я сюды прыйшоў,
Каб нарваць аўса дамоў...
Покуль рваў Мядзведзь авёс –
Зерне на зямлю абтрос.
Паспытаў на смак салому,
Кінуў і пабрыў дадому.
Лёг у пушчы пад сасну
І, прытомлены, заснуў.
Доўга спаў.
Калі ж прачнуўся,
Ад здзіўлення здрыгануўся.
Навакол зямлі няма,
Толькі снежная зіма.
Без харчоў зімой застаўся,
Бо як след не рыхтаваўся.
Ён глыбей забраўся ў снег
І зіму прабыў у сне.
Голад жа калі даймаў –
Лапу тоўстую смактаў.
Так з таго і павялося,
Што ва ўтульнае бярлозе
Спіць Мядзведзь аж да вясны,
Сніць аб звонкім леце сны.
Смокча лапу, бо гуляка,
Ды й худзее, небарака.



# Легенды

## Легенда «Золата ў прыполе»

Жылі-былі на свеце два браты. Адзін быў добры, сціплы, шчыры чалавек. Другі ж наадварот – нядобры, прагны і дурны. Адзін заўсёды быў галодны, жыў у халоднай беднай хатцы, другі – у раскошным доме, меў дарагое адзенне і ад пражэрлівасці ледзь цягаў сваё бруха.

Неяк адвячоркам стукаецца бедны брат у дзверы да багатага.

– Брат, – кажа ён, – дай мне сярнічак запаліць свечку.

А гэта было якраз перад самым Вялікднём. У багатага брата ўсе вокны свяціліся ў агнях, а беднаму не было чым запаліць свечку. Але багаты брат быў такі сквапны, што не толькі не даў яму сярнічак, але загадаў слугу выгнаць яго ў карак. Выйшаў бядняк на вуліцу, ледзь не плача ад гора. Бачыць раптам: дзесьці далёка ў полі блішчыць агонь. Відаць, вогнішча нехта расклаў. Вось ён і пацягнуўся ў поле, каб папрасіць вугольчык. Каля вогнішча сядзеў старэнькі дзядок.

– Добры вечар, – кажа мужык яму, – дай мне, будзь ласкавы, вугалькоў, каб перад святой іконай на велікодную ноч запаліць свечку.

– Трымай прыпол, – кажа дзядок.

Здзівіўся бедны брат: як гэта ў прыполе несці гарачыя вуглі? Але ўсё ж такі падышоў і падставіў прыпол кашулі.

Сыпнуў яму дзед цэлыя прыгаршчы вуголляў. Бядняк аж вочы зажмурыў ад страху, а калі расплюшчыў, то ўбачыў, што ў прыполе золата. Падзякаваў ён дзядку, пакланіўся яму ў ногі і, вясёлы, пайшоў у сваю хаціну.

З таго часу разбагацеў бедны брат. Купіў сабе карову, коней, пабудаваў вялікую хату. Здзіўляліся ўсе навокал, а больш за ўсіх яго багаты брат. Аднойчы прыходзіць ён да бедняка.

– Адкуль ты нажыў такое багацце? – пытаецца.

Той шчыра расказаў, як усё было.

Закусіў ад злосці і зайздрасці губу багаты брат і вырашыў зрабіць так, як некалі зрабіў бядняк.

Дачакаўся ён Вялікдня і пайшоў прасіць у брата сярнічак. Прынёс той яму цэлую скрынку. Але багач кінуў яго на падлогу і пайшоў на вуліцу. Узрадаваўся, калі заўважыў дзесьці далёка маленькі агеньчык. Пабег дадому, апрануў вялікі халат і пашыбаваў у поле. Падышоў да вогнішча, каля якога сядзеў сівенькі дзядок. Падскочыў да яго, схапіў за бараду ды як закрычыць:

– Сып хутчэй золата ў прыпол!

– Добра, – кажа дзядок. – Трымай!

І сыпануў яму прыгаршчы золата. Толькі хацеў багаты брат завярнуць яго ў прыпол, як золата, быццам жывое, паляцела ў паветра. Закрычаў багацей і кінуўся хапаць золата. Бегаў ён так, бегаў, пакуль з яго і дух вон.



## *Легенда «Ліхая доля»*

Жылі-былі два родныя браты. Яны разам нарадзіліся, разам хрысціліся, адны бацька з маткаю іх гадавалі, ды неаднолькавую ім Бог долю даў. За што старэйшы ні возьмецца, усё яму ўдаецца. А малодшы што ні робіць, як ні б’ецца, у яго нічога не атрымліваецца.

Памерлі бацькі. І пачалася паміж братамі сварка. Мо яны б яшчэ і дружна жылі, але паміж жонкамі няма ладу. Як дзве маткі ў вуллі, так і дзве жанчыны ў хаце не ўжывуцца ціха, абавязкова наробяць ліха. Спачатку паміж сабою пасварацца, а потым да мужыкоў прычэпяцца. Тыя праз баб і самі ворагамі стануць.

– Праз жонак сварыцца – значыць грашыць і людзей смяшыць, – кажа малодшы брат старэйшаму. – Давай падзелім бацькоўскія нажыткі па-людску і будзем жыць у згодзе.

– Добра кажаш, – згадзіўся старэйшы брат.

Сварацца жанчыны, а браты не зважаюць на іх. Падзялілі ўсё і разышліся па сваіх кутах, жывуць сабе як могуць. Старэйшы штодзень багацее, а малодшы, як ні стараецца, канцы з канцамі звесці не можа. То карова здохне, то жонка захварэе: няма каму ні жаць, ні абед падаць. Кожны дзень – нягода, кожны крок – прыгода. Жонка лае, зневажае, сваякі дзьмуцца, суседзі смяюцца.

– Боская воля, такая мая доля, – кажа малодшы брат. – Калі долі няма – пніся не пніся, нічога не парадзіш, хоць ты засіліся.

Праходзіць неяк бядак паўз дзялянку, на якой жонка багатага брата жыта дажынала. Побач маленькая дзяўчынка калыхала ў зыбцы[1] дзіця брата.

– Ты чыя будзеш, дзяўчынка? – пытае бядняк.

– Я – доля гэтага дзіцяці, – адказвае дзяўчо.

Пастаяў-пастаяў бядняк і вырашыў знайсці сваю долю.

Ідзе з дзялянкі на дзялянку, з палянкі на палянку. У гаі пад вярбою сустракае старога дзеда з сівою барадою. Падышоў, нізка яму пакланіўся.

---

[1] **Зыбка** – калыска, падвешаная да столі.

– Чалавеча божы, чаго тут блукаеш? Чаго ў гаі шукаеш? – пытае дзядок.

– Долю сваю шукаю, – адказвае бядняк.

– Твая доля – валацуга, па гаі гуляе ды песні спявае. На табе кіёчак, ідзі па полі, там і ўбачыш сваю долю.

Бядняк падзякаваў дзеду. Узяў кій і пайшоў шукаць сваю долю. Доўга ішоў ён ці не вельмі, аж бачыць – пад дубам дзяўчына ляжыць на мяккай траўцы. Схапіў бядняк яе за косы і давай пярэсціць кіем, давай вучыць, як на свеце жыць. Доля просіцца, абяцае, што стане стараннай, будзе дбаць[1] пра дабрабыт гаспадара.

– Так я табе і паверыў, – гаворыць бядняк. – Калі гэта было, каб бедны стаў багатым?

– Зраблю цябе багатым, – стаіць на сваім доля і сыпле яму ў кішэнь прыгаршчамі грошы.

– Бяры, спажывай, як захочаш, – кажа доля. Сказала так і знікла з вачэй.

Доўга не мог апамятацца ад радасці малодшы брат. Гэта ж трэба: быў бедняком і раптам разбагацеў.

На свеце толькі той шчасце мае, каму доля спрыяе, або хто сваю долю ў руках трымае.



[1] **Дбаць** – праяўляць клопаты аб кім-, чым-небудзь.

# Апавяданні з кнігі «Ніколі не забудзем»

## «Важнае заданне»



У апошні час наш атрад перабраўся з Амелькаўскіх лясоў на другі бок Дняпра, бліжэй да Лоева. Наш камандзір Васіль Анатольевіч Зарубаў мяне ведаў, бадай[1], лепей за ўсіх: ён да вайны быў дырэктар нашага Лоеўскага дзетдома. Аднойчы ён паклікаў мяне ў сваю зямлянку.

– Вось што, Косця,– сказаў ён,– ты павінен выканаць адно важнае заданне. Заўтра пойдзеш у Лоеў, у наш былы дзетдом.

Я ўважліва слухаў Васіля Анатольевіча. Мне прыемна было адчуваць, што ён даручаў мне важнае заданне. Прытым жа цікава было паглядзець будынак нашага дзетдома, дзе мы раней займаліся. Там цяпер знаходзіўся нямецкі штаб.

– Ты ведаеш выхады і ўваходы ў дзетдом лепш за ўсіх, а гэта зараз якраз і патрэбна,– гаварыў далей Васіль Анатольевіч, пакурваючы люльку[2], якую да вайны мы падарылі яму ў дзень імянін.– Міну з гадзіннікавым механізмам знаеш?

– Так,– адказаў я, здагадаўшыся, што павінен буду рабіць.– Мы ў гуртку падрыўнікоў вывучалі...

– То вось гэтую міну трэба падсунуць фрыцам на абед. Зробіш?

– Вядома, зраблю,– сказаў я.

Мне тады здавалася, што падлажыць міну будзе зусім лёгка. Васіль Анатольевіч устаў і паклаў мне на плячо руку, як даросламу.

---

[1] **Бадай** – рус.: пожалуй.

[2] **Люлька –** прылада для курэння, якая складаецца з цыбука і галоўкі, пустой ўнутры, у якую насыпаюць тытунь.



– Партызан Косця Бадравец, ідзі да майго памочніка Валодзькі; я зараз падыду, і ты атрымаеш падрабязныя ўказанні, што і як рабіць.

У Вішнёўскім пасёлку, у бабулі Насты, якая была сувязной у атрадзе, я надзеў лахманы[1], вялікую барановую шапку, а маленькую міну заматаў у анучы і падвязаў да нагі. У дарозе ўвесь час ішоў мокры снег. Ад доўгай хады нага, да якой была падвязана міна, пачала млець. Я перайшоў раку і нарэшце ўбачыў Лоеў. Парк, што стаяў над ракой, быў высечаны, і там тырчалі адны толькі пні. У атрадзе Васіль Анатольевіч з Валодзькам мне параілі зайсці да Арцёма, былога вадавоза з нашага дзетдома. Часта ён расклейваў на лоеўскіх будынках лістоўкі, якія мы яму перадавалі.



Я пастукаў у нізенькае акенца. Хутка мне адчыніла Арцёмава дачка Галя. Ёй было гадоў чатырнаццаць, так як і мне.

– Бацькі дома няма,– сказала яна.– Яго пагналі салдаты мост будаваць.

Зморaны, я заснуў у Галінай хаце.

Яшчэ ў зямлянцы Васіль Анатольевіч мяне папярэдзіў, каб я не спяшаўся, а добра ўсё выгледзеў і ўжо толькі тады прыступаў да справы.

Назаўтра я падышоў да будынка былога дзетдома. На ганку стаяў нямецкі вартавы. Пад паветкай[2], дзе раней у нас змяшчалася сталярная майстэрня, дыміла палявая кухня. Я рашыў перш за ўсё прабрацца да кухні. Міна ў мяне ўжо ляжала за пазухай.

---

[1] **Лахманы**– старое, паношанае або падранае адзенне; лахмоцце.

[2] **Паветка** – тое, што навісае, утвараючы падабенства па– веці; рус.: навес.

«А што, калі завесці механізм і як-небудзь укінуць міну ў каструлю з кавай?» – падумаў я.

Я смела накіраваўся да паветкі. Раззлаваны немец, што стаяў на ганку, грозна выставіў аўтамат, які вісеў у яго на шыі. «Не пусціць»,– думаў я, паказваючы вартавому, што я галодны. Аднак немец адышоў ад ганка і замахнуўся на мяне вальком[1], што валяўся каля сцяны. Тоўсты повар завіхаўся ля кухні і скоса пазіраў на мяне. Бачачы, што я ўсё ж такі кірую прайсці да кухні, вартавы злосна зароў і схапіў аўтамат. Я кінуўся ўцякаць.

Начаваў я зноў у Галі, якая баялася адна без бацькі. І толькі на другі дзень мяне раптам паклікаў повар да кухні.



Спачатку я спалохаўся. Мне здалося, што немец бачыць за маёй пазухай маленькую чорную штучку. Повар паказаў на сякеру і дровы. Я зразумеў, што ён хоча, каб я іх пакалоў. Я азірнуўся на вартавога. Той ківаў галавой. Повар узяў адну каструлю з чорнай кавай і панёс у памяшканне.

Поруч стаяла яшчэ адна такая каструля. Я захваляваўся і не папаў сякерай па палене. Вартавы азірнуўся на вуліцу. У гэты момант я хутка выцягнуў міну і завёў механізм. Сэрца маё калацілася, мне здавалася, што міна доўга не заводзіцца. Але яна ўжо ціхенька стукала, як кішанёвы гадзіннік: механізм завёў на дзесяць мінут. Праз дзесяць мінут яна павінна ўзарвацца. Напружана азіраючыся па баках, апусціў міну ў каву. Міна ціха звякнула аб дно.

Потым я схапіў сякеру і з сілай пачаў секчы дровы. У гэты час падышоў повар і заківаў галавой, паказваючы на жывот, што мяне добра накорміць. Затым ён узяў каструлю і панёс яе ў штаб.

[1] **Валёк** – драўляны прамавугольны брусок з ручкай для выбівання бялізны пры паласканні або для качання; качалка.



Цяпер трэба было ўцякаць. Але як бегчы, калі вартавы затрымае і прымусіць зноў секчы дровы? Здалося, што мяне нехта абліў варам[2]. «Праз дзесяць мінут – капцы»,– думаў я. Мне ўяўлялася, што там, у пакоі, повар ужо вылавіў чарпаком міну і зараз выбежыць на двор.

Раптам вартавы выцягнуўся на ганку. Да штаба падкаціла маленькая зялёная машына. Зараз жа з пакоя выскачылі два афіцэры і адчынілі дзверцы. З машыны выйшаў сухенькі дзядок з крыжам на грудзях. У той жа час з дзвярэй спрытна шмыгнуў тоўсты повар і заківаў на мяне, каб я непрыкметна ўцякаў па-за машынай.



Не памятаючы сябе ад радасці і хвалявання, я праскочыў праз разбураныя вароты і пабег вуліцай. Потым завярнуў улева і цераз вокны руін цаглянага дома кінуўся да ракі.

Ззаду раптам загрымеў выбух. Застрачыў аўтамат, прагудзела грузавая машына. Але я ўжо быў далёка. Спыніўся аддыхацца ў хмызняку, пад крутым берагам Дняпра, і засмяяўся: «Гэта вам Васіль Анатольевіч кавалак дзетдомаўскага цукру паслаў. Ад яго і зубы, мусіць, павыскаквалі...»

Пасля мы даведаліся, што міна разнесла на кавалкі чатырох афіцэраў і сухенькага падпалкоўніка. Васіль Анатольевіч казаў, што асабліва я добра ўладзіў з падпалкоўнікам, па загаду якога не адна вёска была спалена і расстраляны сотні людзей.

[2] **Вар** – ускіпелая гарачая вада.

Мяне ўзнагародзілі медалямі «За адвагу» і «Партызану Айчыннай вайны І ступені».



Цяпер я вучуся ў Лоеўскай сярэдняй школе, а Васіль Анатольевіч працуе дырэктарам дзетдома ў Васілевіцкім раёне. Нядаўна ён быў у Лоеве, і мы аглядалі тое месца, дзе адбыўся выбух. Там зараз адрамантаваны клас і знаходзіцца канцылярыя нашай школы. На месцы ж паветкі нам пабудавалі лесвіцу і добры турнік для фізкультурных практыкаванняў. Ніяк нельга пазнаць цяпер гэтага месца. А фізруком у нас Валодзька Бандарэнка – былы памочнік Васіля Анатольевіча.

*Косця Бадравец (1931 г.р.)*

# «Як я стаў гвардзейцам»



Да вайны я жыў у вёсцы Марынішча Расонскага раёна Віцебскай вобласці. Маці працавала ў калгасе, а бацька быў начальнікам пажарнай дружыны. Я закончыў два класы Марынішчанскай школы. Летам купаўся, лавіў рыбу ў Дрысе.

Калі пачалася вайна, бацьку ў Чырвоную Армію не ўзялі, бо ён быў хворы. Мы сталі капаць у садзе зямлянку – сховішча ад бомбаў. Туды хаваліся я, мама, бацька і бабуля.

У той дзень, як немцы ўпершыню абстрэльвалі наша сяло, мы сядзелі ў гэтым сховішчы. Калі супакоілася, мы вылезлі з зямлянкі. Я ўбачыў, што сцяна нашай хаты прастрэлена кулямі.

Потым у вёску прыйшлі немцы. Але я іх не бачыў зблізку. Мы ўцякалі ў лес. Карову прывязалі за біла, паклалі на воз пажыткі і разам з усімі паехалі ў гушчар.

Я чуў, што ў нашай вёсцы немцы забіраюць свіней, курэй – усё, што ўцалела на дварах. Я і Пецька Шырокаў парашылі схадзіць у Марынішча і паглядзець.

Прыйшлі. Бачым – салдаты ў зялёных фрэнчах з белымі каўнярамі паклалі дзеда Міхала і б’юць. Ён ляжыць на пасланых дошках, а яны сякуць бізунамі па голай спіне. Мы з Пецем – назад, схаваліся за хлеў, папаўзлі агародамі за сяло – і ў лес. Мы расказалі ўсё, што бачылі. Бацька насварыўся і прыгразіў, каб больш я нікуды не адлучаўся, а пільнаваўся воза.

Сям’я наша вярнулася ў сяло. Але як толькі немцы заглядвалі ў Марынішча, мы зноў хаваліся ў лес. Жыццё зрабілася цяжкім. Зіма надышла. Наша бабуля прастудзілася, захварэла і памерла.

– Пайду ў партызаны,– сказаў бацька мацеры.

Я вельмі рад быў, што мой тата будзе партызан. Бацька пайшоў. Мама і я засталіся дома. Калі бацьку здаралася вольная часіна, ён прыходзіў да нас.



Гэта было ў 1942 годзе. У нашым раёне зрабіўся партызанскі край. Партызаны стварылі моцную абарону ад немцаў. Я сам хадзіў капаць канавы, каб танкі не прарваліся да нашага сяла.

Аднойчы бацька ўзяў мяне з сабой у лес. Мне хацелася пабачыць партызанскі атрад. У лесе я спаткаў многа дзядзькоў. Я таксама хацеў застацца ў атрадзе, але трэба было памагаць маме.

Летам нямецкія самалёты спалілі наша жыта. Я дапамагаў маме ўпраўляцца з хатнімі справамі і час ад часу хаваўся ў лес. Немцы рабілі аблавы па вёсках. Яны стварылі блакаду.



Прайшла зіма. Надышоў сакавік месяц. У той дзень, як я пачуў першых жаваранкаў, вечарам да нас прыехала фурманка[1]. Узброеныя дзядзькі насцеж расчынілі дзверы і ўнеслі ў хату штосьці доўгае, захутанае ў кажух. Гэта быў забіты бацька. Маці заплакала, загаласіла. Партызаны пачалі расказваць, што мой бацька вельмі смела біўся з немцамі. Асабліва я заплакаў тады, калі закапалі на могілках бацьку і паставілі над яго магілай помнік – белы слупок з чырвонай зоркай.

Застаўся я жыць з адной мамкай. Партызаны нам дапамагалі. Яны далі нам карову.

[1] **Фурманка** – падвода для перавозкі грузаў.



Я парашыў набыць зброю. Я стаў рабіць наган, каб ён страляў сапраўднымі патронамі. Знайшоў сук, да яго прымацаваў дротам трубку, а ў яе ўклаў яшчэ адну трубку, заклаў туды патрон так, што цвік, адцягнуты гумай, удараў па капсулю. Я пайшоў страляць: як стрэліў, дык і разарвала мой самаробны наган. І пальцы на левай руцэ да касці разадрала.

Калі Чырвоная Армія пачала гнаць немцаў назад, мы пачулі, што зямля гудзе, сталі чуваць разрывы снарадаў. З Марынішча ўсе людзі пайшлі ў лес. Я з маткай спяшаўся, але немцы на матацыклах дагналі нас каля лесу. Мама толькі крыкнула:

– Сынок.

З многімі людзьмі я ўцёк. Спыніўся, апамятаўся, мне стала шкада мамы. Я стаў думаць, што мне рабіць, куды мне ісці, і ўспомніў партызан. Я пайшоў туды, да іх у атрад, каб помсціць немцам, як дарослы.

У атрадзе я паведаміў, што карнікі захапілі нашых людзей і пастралялі. З боем партызаны пайшлі на тое месца, і я пабачыў тады забітую маму. Толькі доўга змагацца з немцамі атрад не мог. Немцы з большай сілай, з танкамі, з машынамі, рушылі на лес. Партызаны адышлі, і я не паспеў пахаваць маму.

Была восень 1943 года. У партызанскім атрадзе я стаў дапамагаць дзядзьку–повару мыць лыжкі, міскі. На кухні бульбу скроб, чысціў іржавыя патроны.

Аднойчы немцы напалі на нас і ўвесь атрад разагналі па лесе. Я з Шурам Шуміліным, які быў старэйшы за мяне на шэсць год і таксама находзіўся ў партызанах, забрылі ў глыбіню лесу. Мы так далёка забраліся, што не ведалі, куды ісці і дзе мы. Ішоў дождж, навокал дзесьці стралялі. Мы пераначавалі пад елкай. Есці ў нас не было чаго. У Шурыка было масла змазваць карабін. І карабін быў. Селі мы з ім пад дрэвам, пачысцілі карабін і пайшлі шукаць ежы.



Мы пяць дзён харчаваліся ягадамі журавінамі і ўвесь час шукалі наш атрад.

Калі напаткалі знаёмую сцежку, мы сталі асцярожна падкрадвацца да месца размяшчэння нашага атрада. Але там нікога не было, толькі хадзіла курыца, гадаванка дзядзькі-повара. Мы так хацелі есці, што злавілі яе, абарвалі пер’е і, паколькі ў нас не было сярнічак, пачалі есці яе сырую.

Потым пайшлі далей шукаць каго-небудзь з атрада. Нарэшце знайшлі.

– Мы ўжо думалі, што вас немцы злавілі,– сказаў камандзір атрада.

– Нас немцы ніколі не зловяць,– адказалі мы.

Нас завялі ў новы будан і далі добра пад’есці. Дзядзька-повар наліў крупніку з баранінай ды яшчэ па місцы заціркі. Хлеба не было.



Настаў час, калі партызаны злучыліся з Чырвонай Арміяй. Я стаў прасіцца, каб узялі і мяне. Але мяне не хацелі прымаць. Я сказаў, што ў мяне няма ні бацькі, ні маці, і тады лейтэнант Красных, камандзір узвода сувязі, прыняў мяне і нават пачаў зваць «сынам». Я і цяпер вяду з ім перапіску.

Ва ўзводзе я стаў вучыцца вайсковай справе – праходзіў уставы, вывучаў тэлефонныя апараты. Тут я ўпершыню ў жыцці атрымаў карабін. Я быў так рады, што нідзе з ім не разлучаўся. Цяпер на мне была вайсковая форма. Я зваўся выхаванцам Першага Прыбалтыйскага фронту.

Наша стралковая брыгада знаходзілася ў Віцебскай вобласці да 15 мая 1944 года. У гэты дзень мы пайшлі ў наступленне. Я ўжо ўмеў цягнуць

сувязь, выдатна ведаў усе няспраўнасці тэлефонных апаратаў – і сваіх і нямецкіх. Я ішоў услед за разведчыкамі і прымаў удзел у вызваленні горада Полацка.

У Полацку нашу брыгаду расфарміравалі. Наш камандзір стралковай брыгады загінуў у баі. Цяпер я трапіў у батальён сувязі. І калі пайшлі ў наступленне далей, мне далі гвардзейскі значок. Я стаў гвардзейцам. З нашым гвардзейскім батальёнам я прайшоў Польшчу, Літву, Латвію. Мы многа вызвалілі гарадоў, але назвы іх усе такія, што запомніць цяжка. Вось, памятаю, у Рызе адзін дзядзька распытаў у мяне, як я трапіў у армію, і даў мне вялікі букет кветак. Я падзякаваў.

– Трымайся, сынок! – сказаў ён.– Хутка закончыцца гэтая вайна?

Я адказаў:

– Як да Берліна дойдзем.

Але я не дайшоў да Берліна. У Прусіі было такое здарэнне.



Я і тры разведчыкі – Кузьмін, Саўчанка і Байкадамаў – пайшлі да немцаў у тыл. Нам трэба было даведацца, колькі ў немцаў батарэй і дзе яны знаходзяцца. Пайшлі ноччу. Узялі аўтаматы і дзве шпулькі з провадам. Цераз лінію абароны ісці было страшна, але мы перабраліся шчасліва. Ішлі разам, пакуль ставала проваду. Тады я застаўся наладжваць сувязь, а разведчыкі пайшлі далей. Я падключыў апарат, паклікаў свой пазыўны, сказаў, што ўсё ў парадку, і пачаў маскіравацца. Праз нейкі час, калі стала світаць, Саўчанка прынёс мне паперку. На паперцы былі запісаны квадраты на карце і колькасць нямецкіх батарэй. Ён сказаў мне перадаць гэта камандзіру, а сам пайшоў да таварышаў. Я даў званок, чую – ручка апарата лёгка круціцца. Значыць, сувязі няма. Я пайшоў шукаць парыву на лініі. Іду, шукаю, а ўжо світае. Хутка знайшоў адзін канец проваду, потым другі і пачаў іх звязваць.



Раптам з-за кустоў паказаліся два немцы. Яны ішлі да мяне, але пакуль што мяне не бачылі Я хапіўся за аўтамат, прыклаўся і даў чаргу. Немцы паваліліся. Я хацеў ісці да апарата, а пасля парашыў: можа, у немцаў якія важныя дакументы. Пайшоў і забраў усё, што было ў іх з дакументаў. А зброю іх у кусты пакідаў. Вярнуўся і перадаў па тэлефоне весткі, а таксама і тое, што са мною было. Камандзір адказвае:

– Схавайся дзе-небудзь там, каб нашы снарады не закранулі. Зараз мы распачнём агонь.

Калі пяхота пайшла ў наступленне, мяне падабралі нашы байцы.

На другі дзень капітан Анохін выклікаў мяне са строю.

– Гвардыі радавы таварыш Казлоў, вас узнагароджваем медалём «За адвагу».

Я адказаў:

– Служу Савецкаму Саюзу!



Я з яшчэ большай ахвотай пайшоў у наступленне, помсціць немцам за бацьку і маці, але хутка настаў Дзень Перамогі. Дзень Перамогі я спаткаў у Данцыгу і на радасці ўсе патроны і ракеты перастраляў.

Пасля вайны наш батальён тры месяцы стаяў на беразе Балтыйскага мора. Я часта ездзіў на лодках, караблях гуляць у мора.

А калі надышоў навучальны год, мяне накіравалі вучыцца.

*Алік Казлоў (1932 г.р.)*

# «Буду памятаць»

Нашу вёску падпалілі немцы. Мая мама, бабулька і я з брацікам Толікам уцяклі ў лес. Назаўтра, калі мы вярнуліся з лесу, вёскі ўжо не было – яна згарэла дашчэнту[1]. Над вогнішчам слаўся ўдушлівы дым. Высокія коміны[2] стаялі, як помнікі на могілках.



Мы ўсёй сям’ёй пайшлі ў суседнюю вёску Варатынь. Там жыла мая цётка. Пажыць тут доўга не прыйшлося. На вёску, як каршуны, наляцелі немцы, падпалілі яе, а ўсіх жыхароў ад старога да малога пагналі невядома куды. Доўга гналі народ па незнаёмых мясцінах. Калі людзі адставалі, не маючы сілыісці, іх падганялі гумавымі палкамі і прыкладамі. Ад хады ногі мае распухлі і пасінелі. Мама несла на руках Толіка. Яна так стамілася, што ледзь-ледзь крочыла. Яе твар быў страшэнны – белы-белы, з незнаёмымі вачыма і ўвесь мокры, ці то ад поту, ці то ад слёз – цяжка было пазнаць. Мама доўга несла Толіка і не заўважыла, што ён мёртвы... Спачатку ён нібы заснуў на руках, а потым і памёр, бедны, мусіць, ад голаду ды ад смагі[3].

Два месяцы нас гналі кудысьці. Потым усіх людзей пасадзілі на нейкай станцыі ў вагоны і павезлі. Усіх мучыла смага. Некаторыя прыпадалі сухімі губамі да вільготных дошак дзвярэй вагона...

Цягнік спыніўся ў нейкім лесе. Людзей выгналі на шырокую палянку, на якой стаялі баракі[4]. Вакол баракаў цягнуліся высокія рады калючага дроту, і было вельмі многа вартавых. Хтосьці сказаў, што гэта канцэнтрацыйны[5] лагер.

---

[1] **Дашчэнту** – начыста, датла; зусім, поўнасцю.
[2] **Комін** – труба для адводу дыму з печы.
[3] **Смага** – моцнае жаданне піць.
[4] **Комін** – труба для адводу дыму з печы.
[5] **Канцэнтрацыйны лагер** – месца масавага зняволення і знішчэння ваеннапалонных і інш.

Маю маму спалілі, бабуля таксама памерла, і я застаўся з усёй сям'і адзін. Я не прыпомню, колькі часу знаходзіўся ў лагеры.



Аднойчы раніцою здарылася штосьці незвычайнае. Нас не будзілі гумавымі палкамі, як заўсёды, і каля дзвярэй не было вартавога. Калі мы выйшлі з барака, на двары ўжо былі нашыя чырвонаармейцы. Многія плакалі ад радасці. Адзін салдат узяў мяне на рукі. Я падумаў: «Вось які ён дужы, такога вялікага гэтак лёгка на руках трымае».

Салдат трымае мяне на руках, а ў самога на вачах слёзы...

Цяпер я жыву ў дзетдоме ў Бабічах.

*Аркадзь Навуменка (1935 г.р.)*
*Жлобінскі раён.*

# «Тата Гіса»

Калі пачалася вайна, тата наш сабраўся, пацалаваў нас усіх і пайшоў на вайну. Засталіся мама і нас трое: я, браты Вова і Ваня. Мне было дзесяць год, Вову – сем, а Ваню – чатыры.

Пасля з’явіліся немцы і сталі хадзіць у нашу вёску Някрасава. Яны забіралі кароў і шукалі партызан, якія прыходзілі ў вёску. Часта партызаны заходзілі і да нас і начавалі ў лазні[1]. Мама нас папярэджвала, каб мы нікому не прагаварыліся. Асабліва мы ўгаварвалі Ваню, бо ён быў малы.

Адзін раз у нас быў партызан, якога называлі Грыша. Ён быў вясёлы, добры, і мы ўсе яго любілі. Ён гуляў з Ванем, і той называў яго «Гіса».



Раптам мы ўбачылі, што да нас ідуць тры немцы. Мы ўсе перапалохаліся. Грыша хацеў быў уцякаць, але было позна. І схавацца не было як. Тады мама сказала нам:

– Дзеці! Называйце яго татам. Разумееце?

Мы з Вовам добра разумелі, але ўсе баяліся за Ваню. Мы сталі гаварыць яму, каб ён называў Грышу татам, каб не забыўся, бо немцы тады ўсіх нас паб’юць.

А немцы былі ўжо на двары. Мама дала Грышу татаву рваную світку, малаток і сказала:

– Папраўляй шафу.

А ў шафы дзверцы былі паламаныя, ледзь трымаліся на ніжняй завесцы. Грыша пачаў стукаць малатком, здымаць дзверцы.

Калі немцы былі ў сенцах, я закрычала:

– Тата! Вова дражніцца.

[1] **Лазня** – спецыяльнае памяшканне, дзе мыюцца і парацца.

Калі немцы ўваходзілі ў хату, Вова крычаў:

– Тата! Ліда б’ецца.

Грыша павярнуўся да нас і строга крыкнуў:

– Ціха! Чаго вы тут не падзялілі!

Убачыўшы немцаў, Ваня закрычаў:

– Тата Гіса! Тата Гіса!

Мы зусім спалохаліся: хто ж так называе свайго татку.

Я ўзяла Ваню і паставіла яго ў шуфляду ад шафы, дзе была бялізна. Ваня смяяўся і ўсё паўтараў:

– Тата Гіса! Тата Гіса!

Не ведаю, ці яму спадабалася гэтая гульня, ці ён стараўся паказаць немцам, што гэта яго «тата», але ён больш як трэба гаварыў «тата Гіса».

Толькі немцы не звярнулі на яго ўвагі. Яны спыталіся ў мамы:

– Партызаны ёсць?



– Няма,– адказала яна.

– А гэта хто?

– Мой муж.

А Грыша быў, мусіць, маладзейшы за маму. Ён стараўся не паказваць немцам свой твар і зноў застукаў малатком. Я падбегла да яго, прытулілася і нібы заплакала.

– Тата, я баюся,– сказала я.

Ён абняў мяне і сказаў:

– Не бойся, дачушка, яны нічога табе не зробяць.

Тады падышоў Вова і таксама прытуліўся да «таткі». Я заўважыла, як маці здаволена ўсміхнулася. Толькі Ваня занадта стараўся.

– Тата Гіса! Тата Гіса!

На шчасце, немцы не звярталі ўвагі на яго балбатню. Адзін падышоў да печы, падняўся на дыбачкі і паглядзеў наверх. Другі заглянуў пад ложак. Добра, што Грыша не хаваўся.



Немцы выйшлі, і мы ўсе былі вельмі рады. Радаваўся і Ваня.

– А я сказаў «тата Гіса», ага!

Але нядоўга мы радаваліся. Праз некалькі часу немцы напалі на нашу вёску, знішчылі яе, пабілі многа людзей. Загінула і наша мілая мама... Не вярнуўся і татка.

Толькі мы засталіся жывыя і цяпер усе трое жывём у дзетдоме № 1, у г. Барысаве.

*Ліда Волкава (1932 г.р.)*